УДК 392(476)

# Звычай “бонда” ў беларускай традыцыйнай культуры

Карбалевіч Н. М.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Для беларускай традыцыйнай культуры характэрным было своеасаблівае стаўленне сялянаў да прыватнай і грамадскай уласнасці, а таксама цэлы спектр спецыфічных грамадскіх узаемаадносінаў вакол маёмасці. У традыцыйнай беларускай культуры існавалі разнастайныя віды і механізмы рэгуляцыі грамадскіх адносінаў сялянаў, якія ўзнікалі вакол маёмасці. Адным з самых цікавых механізмаў рэгуляцыі маёмасных адносінаў быў звычай “даваць бонду” ці “даваць бондачку”. Бонда – гэта сялянскі звычай дзяліцца з суседзямі ці ўвогуле аднавяскоўцамі прадуктам, які атрымліваеш у гаспадарцы. Найбольшае распаўсюджванне ў крыніцах атрымала апісанне звычаю даваць бонду ў дачыненні да пчалярства. Узгадванне пра мядовую бонду сустракаецца ў працах А.К. Сержпутоўскага, Е.Р. Раманава, З. Глогера, М.Я. Нікіфароўскага і інш.

Увогуле стаўленне да пчалярства ў беларускіх сялянаў мела сакралізаванае значэнне, і адпаведна да галоўнага прадукту пчалярства таксама было асабліва далікатнае і ўзрушанае стаўленне.Звычай загадваў пчаляру даваць шчодрыя мядовыя бонды ў свята Мядовы Іспас, які быў таксама святам збору мёду.У міжсуседскіх зносінах мядовая бонда таксама адыгрывала і ролю своеасаблівай кампенсацыі суседзям за клопат, які прыносілі пчолы летам, калі яны ўтрымліваліся на падворку.У сялянскім асяродку бонду таксама давалі свежым мясам і салам, злоўленай у вялікай колькасці рыбай, мясам забітых на паляванні звяроў, садавінай і гароднінай, хлебам з новага жыта ці пшаніцы і інш.

Бонда з’яўлялася звычаем, які рэгуляваў маёмасныя адносіны сялянаў у грамадскім кантэксце і забяспечваў іх своеасаблівы баланс, замацоўваў ідэю грамадскага абмену, што давала магчымасць атрымаць пэўны прадукт ці аддзячыць за дапамогу. У якасці грамадскіх функцый бонды можна вылучыць стабільнае падтрыманне гаспадарчай сістэмы грамады, стварэнне становішча, калі нястачу прадукту ці рэчы можна было адносна нескладана вырашыць, атрымаўшы бонду; таксама традыцыя бонды мела гаспадарчую мэтазгоднасць калектыўнага ўжывання прадукту пры немагчымасці яго доўгага захоўвання; вылучаецца таксама і функцыя падтрымання сацыяльнай стабільнасці праз размеркаванне лішкаў прадуктаў харчавання. Можна зрабіць выснову аб тым, што бонда з’яўлялася важнай формай абмену і механізмам рэгуляцыі ўзаемаадносінаў у асяродку грамады.